Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК
# Раздзел 1. ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 11*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны савет* дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 23.05.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.06.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 23.06.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. М. Бігеза

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) для напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент).

Вучэбная дысцыпліна «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» складаецца з двух раздзелаў: «Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» і «Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння першага раздзела «Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк».

Вучэбная дысцыпліна «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» дапамагае студэнтам засвойваць веды аб узнікненні і развіцці сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк. Веданне яе гісторыі, тэарэтычных асноў, сфер рэалізацыі, суб’ектаў сацыякультурнай дзейнасці паспрыяе студэнтам у будучай прафесійнай дзейнасці выкарыстоўваць сацыяльна-культурную дзейнасць як шырокую галіну сучасных педагагічных ведаў, аснову рэабілітацыі розных груп насельніцтва, іх сацыяльную абарону і падтрымку, утварэнне спрыяльнага асяроддзя для развіцця і рэалізацыі сацыяльна-культурнай актыўнасці карыстальнікаў бібліятэк у сферы дасуга і творчасці.

Вучэбная дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца ў пэўнай ступені на набытыя раней студэнтамі кампетэнцыі пры вывучэнні абавязковых дысцыплін агульнанавуковага і агульнапрафесійнага цыкла – «Бібліятэказнаўства», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія» і звязана з дысцыплінамі: «Культуралогія», «Педагогіка», «Псіхалогія». У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні дадзенай дысцыпліны, з’яўляюцца асновай для засваення іншых дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла: «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і ме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неджмент», дысцыплін, звязаных з падрыхтоўкай бібліятэчных прадуктаў і паслуг і задавальненнем патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – засваенне студэнтамі гісторыка-тэарэтычных ведаў, заканамернасцей, спецыфікі сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэкі, яе ролі як сацыяльна-культурнага інстытута сучаснага грамадства; фарміраванне прафесійных, акадэмічных, сацыяльна-асобасных кампетэнцый будучых спецыялістаў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступных *задач:*

– засвоіць веды адносна асноўных гістарычных перыядаў станаўлення і развіцця сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– авалодаць ведамі ў галіне канцэпцый, прынцыпаў, функцый сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– развіць здольнасці да выкарыстання метадаў арганізацыі і тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

Для набыцця прафесійнай кампетэнцыі ў выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– стан і тэндэнцыі развіцця сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– інфраструктуру сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– суб’ектаў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– каштоўнасныя арыентацыі ў стварэнні сацыякультурнага асяроддзя ў бібліятэках;

– сутнасць і асноўныя этапы тэхналагічнага працэсу сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

– мэты, задачы, функцыі і прынцыпы рэалізацыі тэхналогій сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў прафесійнай і навуковай дзейнасці;

– праводзіць параўнальны аналіз і ацэнку розных тэарэтычных канцэпцый у сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк з мэтай прымянення назапашаных ведаў у практычнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк розных тыпаў;

*валодаць:*

– сучаснымі метадамі эфектыўнай сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– методыкамі аналізу сацыякультурнага асяроддзя бібліятэкі.

У ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій, якія садзейнічаюць глыбокаму засваенню ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння вучэбных і даследчых задач, вылучаюцца: праблемнае навучанне, вучэбнае даследаванне, метад аналізу канкрэтных сітуацый, камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, вучэбныя дэбаты і інш.).

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў;

**прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-8. Устанаўліваць і падтрымліваць трывалыя сувязі з рознымі сацыяльнымі інстытутамі (сям’я, школа, установы культуры, адукацыі, прадпрыемствы і інш.) з мэтай фарміравання спрыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-9. Арганізоўваць і праводзіць інфармацыйна-асветніцкія, адукацыйныя, культурна-творчыя, культурна-дасугавыя і рэкрэацыйна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

ПК-10. Ажыццяўляць планаванне, улік і справаздачнасць бібліятэчна-інфармацыйнай работы.

ПК-11. Выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя метады падчас бібліятэчнага абслугоўвання і правядзення разнастайных сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках розных тыпаў і відаў.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» выкарыстоўваюцца наступныя формы работы: пазааўдыторная і аўдыторная, групавая і індывідуальная.

Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў па дысцыпліне ў праграму вытворчай практыкі.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам і адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк» для напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) усяго прадугледжана 128 гадзін, з іх 68 – аўдыторныя заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк» прадугледжана 64 гадзіны, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 12 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны, практычныя заняткі – 12 гадзін, лабараторныя заняткі – 6 гадзін. Рэкамендаванай формай выніковага кантролю з’яўляецца экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі |
| Уводзіны | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел I. Гістарычныя аспекты станаўлення і развіцця сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк** | | | | | |
| *Тэма 1.* Асноўныя этапы станаўлення сацыякультурнай дзейнасці | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Тэндэнцыі развіцця сацыякультурнай дзейнасці ў савецкі і постсавецкі перыяды | 4 | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Тэарэтычныя асновы сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк** | | | | | |
| *Тэма 3.* Тэрмінасістэма ў галіне сацыякультурнай дзейнасці | 6 | | 2 | | 4 |
| *Тэма 4.* Сацыяльныя функцыі і прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 5.* Суб'екты сацыякультурнай дзейнасці | 10 | 2 | | 6 | 2 |
| *Тэма 6.* Сацыякультурная сутнасць дасуга і яго асноўныя сучасныя канцэпцыі | 6 | 2 | | 4 | |
| *Тэма 7.* Тэарэтычныя аспекты тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці | 3 | 1 | | 2 | |
| **Разам…** | **34** | **12** | **4** | **12** | **6** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк. Раздзел 1. Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Тэарэтычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны, яе ўзаемасувязь з цыклам агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін. Веды і кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння дысцыпліны. Асноўныя віды заняткаў, арганізацыя самастойнай работы. Формы кантролю. Забяспечанасць дысцыпліны вучэбна-метадычнай літаратурай. Дэфініцыя сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк як цэласнай з'явы, яе сутнасць.

## Раздзел I. Гістарычныя аспекты станаўлення і развіцця сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк

### *Тэма 1. Асноўныя этапы станаўлення сацыякультурнай дзейнасці*

Вытокі станаўлення сацыякультурнага ўкладу Расіі і Беларусі ў XV–XVIII стст. Першае згадванне аб дасугу ў гістарычных хроніках. Змест дасуга і дасугавай дзейнасці. Адносіны да яе з боку ўлад і царквы. Формы дасугавых заняткаў прадстаўнікоў розных саслоўяў насельніцтва.

Асвета і ўзнікненне сацыяльна-культурных супольнасцей у XVIII ст. Адметнасці культурна-асветніцкай дзейнасці. З'яўленне спецыяльных пазашкольных устаноў. Дзейнасць клубаў як грамадскіх, асветніцкіх устаноў і цэнтраў дасуга.

Змены ў сацыяльнай накіраванасці культурна-асветніцкай і дасугавай дзейнасці ў пачатку XX ст., выкліканыя рэвалюцыйнымі падзеямі ў Расіі.

### *Тэма 2. Тэндэнцыі развіцця сацыякультурнай дзейнасці ў савецкі і постсавецкі перыяды*

Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый у адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі ў галіне асветы, культуры, дасуга працоўных у першыя гады Савецкай улады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дасягненні і негатыўныя працэсы ў сацыяльна-культурным развіцці БССР у 1920–30-я гг. Дзейнасць культурна-асветніцкіх, сацыяльных устаноў у передваенны час і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сацыяльна-культурная сітуацыя ў краіне ў першыя пасляваенныя гады. Узмацненне ўвагі да пытанняў гісторыі культурна-асветніцкай работы, тэарэтычнага асэнсавання актуальных праблем яе зместу, арганізацыі і методыкі пасля выкрыцця культу асобы Сталіна.

Глыбокая перабудова культурна-асветніцкай работы ў 1970–80-я гг. Дэмакратызацыя сістэмы кіравання і дзейнасці, арыентацыя на сацыяльную дасугавую дзейнасць, на пераасэнсаванне прынцыпаў і функцый культурна-асветніцкай работы. Асноўныя формы работы бібліятэк з сям'ёй. Пашырэнне дыяпазону вывучэння запытаў і патрэбнасцей розных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу.

Змены сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі пасля распаду СССР.

Праблемы і перспектывы развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе.

## Раздзел II. Тэарэтычныя асновы сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк

*Тэма 3. Тэрмінасістэма ў галіне сацыякультурнай дзейнасці*

Тэрміны «культурна-асветніцкая работа», «культурна-масавая работа», «культурна-выхаваўчая работа» як відавыя паняцці (У. Я. Трыодзін).

Перагляд навуковай і прафесійнай тэрміналогіі ў галіне культурна-асветніцкай работы ў 1990-я гг. З'яўленне ў навуковай літаратуры версій, дзе ў якасці ключавога сэнсаўтваральнага тэрміна быў «дасуг»: «Педагогіка дасуга», «Педагогіка вольнага часу» (М. А. Арыярскі, А. Ф. Валовік), «Дасугавая дзейнасць», «Культурна-дасугавая дзейнасць» (А. Д. Жаркоў, В. М. Чыжыкаў, М. Ф. Максюцін), «Культуралогія дасуга» (Т. Р. Кісялёва, Ю. Д. Красільнікаў, Г. В. Галавіна) і інш.

Выкарыстанне прапанаваных практыкамі тэрмінаў «культурна-асветніцкая дзейнасць», «педагогіка дасуга», «арганізацыя дасуга».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфічныя дэфініцыі дасуга.

Суадносіны паняццяў «дасуг» і «вольны час». Разнастайныя падыходы да іх разгляду.

Рознабаковыя трактоўкі навукоўцамі дэфініцыі паняццяў «сацыяльна-культурная дзейнасць» і «сацыяльна-культурная дзейнасць бібліятэк».

### *Тэма 4. Сацыяльныя функцыі і прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці*

Паняційнае вызначэнне тэрміна «функцыя». Класіфікацыя функцый і прысутнасць розных падыходаў да яе – сістэмнага, сітуацыйнага, дыферэнцыраванага і інш.

Характарыстыка асноўных функцый сацыякультурнай дзейнасці: камунікатыўнай, інфармацыйна-асветніцкай, культуратворчай, рэкрэацыйна-аздараўляльнай, эканамічнай, функцыі нарматыўна-прававога забеспячэння і абароны канстытуцыйных свабод асобы ва ўмовах дасуга, фінансава-эканамічнага забеспячэння ўстаноў сацыякультурнай дзейнасці, забеспячэння дасугавых форм самадзейнасці насельніцтва, арганізацыя групавой, сямейнай ці асобаснай службы дасуга ў соцыуме. Сацыяльна-культурныя функцыі бібліятэчнай прафесіі.

Прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці як важнейшыя метадалагічныя катэгорыі. Мноства падыходаў у тэорыі і практыцы да іх вызначэння.

Адлюстраванне ў самой катэгорыі прынцыпу асноўных зыходных палажэнняў тэорыі, нормы паводзін і дзейнасці групы людзей, асобнага чалавека, асноўных асаблівасцей функцыянавання розных сацыяльных інстытутаў.

Характарыстыка агульных прынцыпаў сацыякультурнай дзейнасці: прынцыпу педагагізацыі навакольнага сацыякультурнага асяроддзя, асобаснага падыходу, уліку культурнай разнастайнасці ўзаемадзеючых суб’ектаў і аб’ектаў, арыентацыі на культурна-каштоўнасныя адносіны і арганізацыю культуратворчасці.

Адметнасці праяўлення названых прынцыпаў у сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 5. Суб’екты сацыякультурнай дзейнасці*

Шматзначнасць паняцця «суб’екты сацыякультурнай дзейнасці». Структура і класіфікацыя суб’ектаў сацыякультурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці. Іх ўзаемадзеянне ў працэсе рэалізацыі сацыяльна-культурнай палітыкі, якая здзяйсняецца на дзяржаўным, недзяржаўным, сямейным узроўнях.

Асоба як суб’ект сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк. Прыярытэт творчай індывідуалізацыі асобы ў сферы дасуга.

Сацыяльна-культурныя інстытуты, разнастайныя падыходы да пабудовы іх тыпалогіі. Класіфікацыя сацыяльна-культурных інстытутаў у залежнасці ад іх ролевай функцыі адносна спажыўцоў культурных даброт, каштоўнасцей і паслуг. Бібліятэка ў сістэме сацыякультурных інстытутаў. Сям’я як сацыякультурны інстытут. Разнастайнасць тыпаў сучаснай сям’і. Адметнасці і праблемы сямейнага дасуга.

Сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі. Функцыі сродкаў масавай інфармацыі як сацыякультурнага інстытута. Галіновыя ўстановы сацыякультурнага профілю, іх структура.

Сацыякультурныя супольнасці і фарміраванні, іх тыпалогія. Сацыякультурная дзейнасць бібліятэк, сістэма грамадскіх фарміраванняў, арганізацый, фондаў, рухаў і іншых інстытутаў як асяроддзе, якое садзейнічае сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей у сферы дасуга.

### *Тэма 6. Сацыякультурная сутнасць дасуга і яго асноўныя сучасныя канцэпцыі*

Тэарэтычнае вызначэнне паняцця «дасугавыя канцэпцыі».

Характарыстыка асноўных канцэпцый дасуга паводле Т. Р. Кісялёвай і Ю. Д. Красільнікава:

– *дзейнасная канцэпцыя* дасуга, у якой дасугавая (рэкрэацыйная) дзейнасць у вольны час разглядаецца як неад’емная частка спосабу жыцця чалавека;

– *медыка-біялагічныя канцэпцыі* дасуга. Іх аснова – выкарыстанне дасугавага часу як спосабу адаптацыі чалавека да незнаёмых умоў прыроднага і сацыяльнага асяроддзя;

– *культуралагічныя і сацыяльна-культурныя канцэпцыі* дасуга. Іх праяўленне адносна змястоўнага напаўнення вольнага часу на падставе шматфункцыянальнага выкарыстання культурнага комплексу як сродку рэкрэацыі і адпачынку людзей;

– *экалагічныя, прыродаарыентаваныя канцэпцыі* дасуга. Вызначэнне ў іх двух тыпаў адносін чалавека да навакольнага прыроднага асяроддзя ў працэсе яго сацыякультурнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *тэхнаэканамічная канцэпцыя* дасуга, яе дваякі сэнс адносна знаходжання аптымальнага ўзаемадзеяння вытворчай сферы і сферы быту, стварэння спецыяльнай галіны сацыякультурнай дзейнасці, рэкрэацыйнага абслугоўвання, развіцця сферы дасугавых паслуг, індустрыі адпачынку;

– *сацыяльна-кіраўніцкія канцэпцыі*. Прыярытэтная роля ў іх грамадска-палітычных, ідэалагічных, адміністратыўных, знешнеэканамічных рычагоў упраўлення сацыякультурнай сферай.

Спецыфіка праяўлення названых канцэпцый у сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

## *Тэма 7. Тэарэтычныя аспекты тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці*

Паняційнае вызначэнне тэрміна «тэхналогія» сацыякультурнай дзейнасці.

Тэхналогіі як сродкі абмену чалавечымі здольнасцямі і патрэбнасцямі асобы (С. М. Брусаў).

Абумоўленасць тэхналогій сацыякультурнай дзейнасці патэнцыялам дзеяння людзей і ўмовамі, у якіх яны праходзяць.

Структура і асноўныя рысы тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці. Тры асноўныя групы сацыякультурных тэхналогій (паводле А. В. Сакалова, Т. Р. Кісялёвай, Ю. Д. Красільнікава).

Класіфікацыя сацыякультурных тэхналогій.

Асноўныя (сутнасныя) і прыкладныя (другасныя) функцыі сацыякультурных тэхналогій.

Класіфікацыя метадаў, выкарыстоўваемых у сацыяльна-культурных тэхналогіях.

Педагагічныя асновы тэхналогій сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Аксюцік, М. І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць : гісторыка-тэарэтычныя ўводзіны : падручнік / М. І. Аксюцік, Л. В. Каралькова. – Мінск : ІСВ, 2002. – С. 6–17.

*2. Бородина, В.* А. Библиотечное обслуживание: учеб.-метод. пособие / В. А. Бородина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – С. 6–20.

*3. Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга : учебник / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Флинта, 1998. – С. 76–87, 194–211.

*4. Головко, С. И.* Социально-культурные функции библиотечной профессии / С. И. Головко // Библиотековедение. – 2004. – № 6. – С. 32–38.

*5. Дзямешка, Л. А*. Культурна-асветніцкая і адукацыйная дзейнасць бібліятэк Беларусі ў гістарычным аспекце / Л. А. Дзямешка // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск, 2008. – Вып. 6, ч. 2. – С. 85–95.

*6. Дуликов, В. З.* Социально-культурная деятельность за рубежом : учеб. пособие / В. З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 2003. – 84 с.

*7. Жаркова, Л. С*. Методика организации работы библиотеки в сфере социально-культурной деятельности : науч.-практ. пособие / Л. С. Жаркова. – М. : Литера, 2009. – 110 с.

*8. Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – С. 17–43, 95–109, 143–300, 404–438.

*9.* Культурно-досуговая деятельность : учебник / под науч. ред. А. Д. Жаркова, В. М. Чижикова. – М. : МГУК, 1998. – С. 10–71, 72–106, 137–150.

*10. Маркова, В. Н.* Изучение социокультурного пространства библиотеки / В. Н. Маркова // Научные и технические библиотеки. – 2006. – № 5. – С. 43–47.

*11. Мирошниченко, Е. В.* Досуговая деятельность в библиотеке : проблемы теории и практики / Е. В. Мирошниченко // Библиотековедение. – 2011. – № 4. – С. 117–121.

*12. Саликов, А. Э.* Творческая самореализация молодежи в пространстве досуга : инновационный аспект / А. Э. Саликов //


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Воспитание в сотворчестве : сб. науч. ст. – Минск : РИВШ, 2014. – Вып. 6. – С. 150–160.

*13. Смаргович, И. Л.* Основы культурно-досуговой деятельности: учеб.-метод. пособие / И. Л. Смаргович. – Минск : БГУКИ, 2013. – 174 с.

*14.* Социально-культурная деятельность : теория, технология, практика : кол. моногр. Ч. 1 / науч. ред. В. Я. Рушанин ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск, 2005. – С. 67–80.

*15.* Социальные и социокультурные процессы в современной Беларуси : социологический анализ : сб. науч. тр. Вып. 6 / редкол.: Г. М. Евелькин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Экоперспектива, 2005. – С. 343–350.

*16. Тихомирова, И. И.* Библиотека и социально-культурная деятельность / И. И. Тихомирова // Библиотечное дело. – 2015. – № 2. – С. 2–6.

*17. Триодин, В. Е.* Теория социально-культурной деятельности : объект и предмет исследования / В. Е. Триодин // Магистер. – 1998. – № 1. – С. 26–36.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Дадатковая*

*1. Ариарский, М. А.* Новый этап в развитии теории социально-культурной деятельности / М. А. Ариарский // Вестн. Моск. гос. ун-та культуры и искусств. – 2013. – № 1. – С. 102–109.

*2. Бигеза, В. М.* Библиотерапевтические аспекты культурно-досуговой деятельности детских библиотек как средство привлечения детей к чтению / В. М. Бигеза // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва: матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2013 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – С. 240–245.

*3. Бігеза, В. М.* Дзіцячая бібліятэка ў сістэме арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці карыстальнікаў [Электронный ресурс] / В. М. Бігеза // Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества / НББ ; сост. А. А. Капырина. – Электрон. данные (44 Мб). – Минск : НББ, 2007. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – 6 с.

*4. Бігеза, В. М.* Прафесійная падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі: сацыякультурны аспект / В. М. Бігеза // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 29–30 кастр. 2003 г. – Мінск, 2003. – С. 141–150.

*5. Бігеза, В. М.* Спецыфіка і асноўныя напрамкі культурна-дасугавай дзейнасці дзіцячых бібліятэк / В. М. Бігеза // Культура: открытый формат – 2014 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 361–365.

*6. Вавилова, Н. И.* Пути активизации инновационных процессов в культурно-досуговой деятельности / Н. И. Вавилова, Н. А. Грибанова. – Петрозаводск, 1992. – 67 с.

*7. Голуб, А. М.* Формирование ценностных ориентаций молодежи в процессе досуговой деятельности / А. М. Голуб // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2009. – № 4. – С. 53–57.

*8. Жаркова, Л. С.* Культурно-досуговая деятельность : теория, практика и методика научных исследований / Л. С. Жаркова, А. Д. Жарков. – М., 1994. – 240 с.

*9. Зайцев, В. Н.* Социокультурная деятельность библиотек – один из путей развития информационного общества / В. Н. Зайцев // Библиотековедение. – 2006. – № 2. – С. 23–26.

*10. Зимоненко, А. Р.* Библиотека как культурный и досуговый центр / А. Р. Зимоненко. – М., 1990. – 53 с.

*11. Кірухіна, Л. Г.* Самабытная спадчына нацыі : публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый : тэарэтыка-метадычны аспект / Л. Г. Кірухіна. – Мінск, 2005. – 75 с.

*12. Кузнецова, Т. Я.* Библиотека в информационном сообществе: онтологические основания социокультурных трансформаций / Т. Я. Кузнецова // Библиотековедение. – 2011. – № 1. – С. 28–33.

*13. Макарова, Е. А.* Социально-культурная деятельность : состояние и особенности развития / Е. А. Макарова // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 86–92.

*14. Маркова, В. Н.* Изучение социокультурного пространства библиотеки / В. Н. Маркова // Научные и технические библиотеки. – 2006. – № 5. – С. 43–47.

*15.* Мир культуры. Международная мозаика : сравнительный анализ культурной политики зарубежных стран / сост.: Е. И. Кузьмин, В. Р. Фирсов. – М. : Либерия, 2003. – 264 с.

*16. Мосалев, Б. Г.* Досуг : методология и методика социологических исследований : учеб. пособие / Б. Г. Мосалев. – М., 1995. – 96 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка і правядзенне пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;

– экзамен.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзамену.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з’яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па дысцыпліне.

## Рэкамендаваныя формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:

1. Тэарэтычныя асновы тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.
2. Вывучэнне літаратуры па ўкараненні тэарэтычных напрацовак у практычную сацыякультурную дзейнасць бібліятэк.
3. Выкарыстанне інтэрнэт-тэхналогій у галіне сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.
4. Сацыялізацыя дзяцей, падлеткаў у сферы сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК**
**Раздзел 1. ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК**

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,04. Ул.-выд. арк. 0,68. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ